УДК 821.161.3.09

# АДМЕТНАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА САМАПАЗНАННЯ ВІНЦЭСЯ КАРАТЫНСКАГА

**Слівец Вольга Рыгораўна**
Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна
(г. Мазыр, Беларусь)

*В контексте творчества В. Коротынского анализируются особенности художественного осмысления проблемы национального самопознания и самоопределения как ключевой идеи белорусской литературы XIX в.*

**Ключевые слова:** национальное самопознание, малая родина, образ Беларуси, художественная традиция.

*In the context of V. Korotynsky's work, the peculiarities of artistic comprehension of the problem of national self-knowledge and self-determination as a key idea of the Belarusian literature of the 19th century are analyzed.*

**Keywords:** national self-knowledge, motherland, image of Belarus, artistic tradition.

Праблема нацыянальнага самаўсведамлення (што не губляе сваёй актуальнасці і сёння) для беларускай літаратуры XIX ст. мела асаблівае значэнне. Зварот да вывучэння сваіх каранёў, гісторыі і самабытнай культуры беларускага народа, абумоўлены сацыякультурным кантэкстам гэтага перыяду, стаў мастацка-эстэтычнай дамінантай новай мастацкай традыцыі ў літаратуры, засведчыўшы пачатак эпохі нацыянальнага Адраджэння.

Вінцэсь Каратынскі (1831–1891) вядомы як паэт, публіцыст і перакладчык, сябар, вучань і прадаўжальнік творчых традыцый Уладзіслава



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сыракомлі. Нягледзячы на тое, што большасць яго твораў былі напісаны на польскай мове, нельга не адзначыць зроблены ім унёсак у развіццё менавіта беларускага пісьменства, у прыватнасці, у распрацоўку тэмы нацыянальнага самапазнання.

Ураджэнец Наваградчыны (як і А. Міцкевіч), В. Каратынскі паслядоўна называў сябе *ліцвінам*, як і сваіх землякоў (вершы "Пастрыжыны", "Віціннік увесну", "Уладзіславу Сыракомлю" і інш.). Паказальна, што варшаўскія літаратары і газетчыкі, як прасачыў У. Мархель, між сабою таксама празвалі яго *"барадатым ліцвінам"* [2, с. 8]. Увогуле намінатыўнае поле канцэпту *Радзіма* ў кантэксце творчасці В. Каратынскага перважна ўключае такія лексічныя адзінкі, як *Літва*, *літоўская Русь*, якія падкрэсліваюць не этнічны, а гістарычны аспект (як тэрыторыя былога Вялікага Княства Літоўскага) успрыняцця гэтых намінацый, што пацвярджае і геаграфічная лакалізацыя абазначаных тэрыторый: *"…ад Дзвіны да Прыпяці і ад вытокаў Дняпра да Буга…"* [2, с. 152].

Падобнае заўважаем і ў іншых прадстаўнікоў літаратуры XIX ст. (А. Міцкевіча, Я. Чачота, У. Сыракомлі і многіх інш.). Творцы гэтага перыяду імкнуліся не толькі асэнсаваць гістарычную спадчыну беларусаў (ліцвінаў) і зямель, што належаць сучаснай Беларусі, праблемы беларускай дзяржаўнасці, але і дакладна вызначыць яе тэрытарыяльныя межы праз вылучэнне канкрэтных геаграфічных "маркёраў", якімі найчасцей выступаюць гідронімы. Напрыклад, у А. Міцкевіча Беларусь (Літва) – гэта *"край, абняты Дняпром, Чорным морам, Бугам і Нёманам"* [1, с. 32]. *Літоўскі лірнік* – У. Сыракомля – сваю малую радзіму лакальна вызначаў як мясціны, маркёрамі-лакалізатарамі якіх для яго былі *Вялля* і *Нёман* (вершы "Браткі мае з-пад Вяллі, з-пад Нёмна…"). Радзіма для яго – гэта таксама *Літва*, *"Радзіма сэрца – ў Вільні улюбёнай"* [4, с. 66]. Як межы Беларусі (*Літоўскай Русі*) разглядаў А. Ельскі *"разлеглыя абшары: ад вытокаў Дняпра да Буга і Нарава, ад Віліі да Прыпяці…"* [3, с. 342].

Належнае месца ў інтэрпрэтацыі вобраза беларускага краю ў літаратуры абазначанага перыяду належыць яго мастацкаму асэнсаванню як малой радзімы, што абумовіла зварот аўтараў да дэталёвага даследавання роднага краю, апісання яго мінуўшчыны і сучаснасці ў розных аспектах. Так, услед за сваім сябрам і аднадумцам У. Саракомлем В. Каратынскі звяртаецца да напісання гісторыка-краязнаўчых нарысаў ("Віцебск", "Карціны з берагоў Нёмана", "Дзве будоўлі"), падарожных нататкаў ("Наваградчына і Наваградак"): *"…я зрабіў выснову, што Наваградчына і Літва наогул для многіх менш вядомыя за*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Новую Зеландыю <...>... параўнаў свае ўспаміны з надта сціплымі гістарычнымі звесткамі пра мой родны кут – і падаўся ў свет!"* [2, с. 154]. Артыкулы пра беларускія гарады Валожын, Вілейку, Віцебск, Слуцк, Стоўбцы і інш., напісаныя ў журналісцкі перыяд жыцця В. Каратынскага (з 1866 г. падчас працы ў "Газеце Варшаўскай") і ўключаныя ва ўсеагульную польскую энцыклапедыю, сталі арганічным працягам гісторыка-краязнаўчага даследавання Беларусі, пачатага У. Сыракомлем у нататках "Вандроўкі па маіх былых ваколіцах" (1853) і нарысе "Мінск" (1857).

Вызначальна, што створаныя В. Каратынскім мастацкія партрэты беларускага краю, яго мінулага нярэдка падаюцца ў кантэксце гісторыі і культуры іншых краін свету, што, напрыклад, выразна прасочваецца ў нарысе "Карціны з берагоў Нёмана": *"Часам мяне ўражвала геаграфічнае падабенства прастораў, на якіх у малой Азіі нарадзілася «Іліяда», а ў Наднёманшчыне – «Пан Тадэвуш». Тут і там утаптаныя пуцявіны... <...> Па абедзвюх пуцявінах у дагістарычны і гістарычны час цягнуліся процьмы плямёнаў, вымыкаючы наўперад з-пад Гімалаяў, каб дапяць ажно да Атлантыкі, потым пасоўваючыся з захаду на ўсход, каб пашырыць вузкую жыццёвую прастору"* [2, с. 265].

Яшчэ адным напрамкам даследчыцка-краязнаўчай дзейнасці В. Каратынскага сталі яго шматлікія творы ў жанры біяграфічнага нарыса, якія выразна ілюструюць кола пытанняў, што турбавалі аўтара ў вывучэнні мінулага і сучаснага сваёй радзімы: "Некалькі падрабязней пра сям'ю, месца нараджэння і маладосць Адама Міцкевіча", "Дадатак да біяграфіі Адама Міцкевіча"; "Валяр'ян Тамашэвіч" – *"пасмяротны ўспамін"* аб польскім пісьменніку, які быў аднадумцам і паплечнікам аўтара ў літаратурнай справе; "Саламон Рысінскі" пра вядомага фалькларыста, *"містычнага першазбіральніка польскіх прымавак у пачатку XVII стагоддзя"* [2, с. 201]; "Канстанцін Тышкевіч" і "Яўстах Тышкевіч" пра братоў-этнографаў, даследчыкаў старажытнай мінуўшчыны; "Рамуальд Зянкевіч", "Юзаф Ігнат Крашэўскі" – таксама пра вядомых вучоныхэтнографаў, "Юліян Гарайн", "Мікалай Акелевіч" – пра пісьменнікаўкраязнаўцаў і інш.

У цэлым уласна аўтарскія ўспаміны, назіранні і аналітычныя абагульненні, не пазбаўленыя суб'ектыўнасці, арганічна дапаўняюць гістарычныя факты, спрыяюць мастацкаму ўзнаўленню выразнага і шматграннага вобліку Беларусі ў розныя часавыя адрэзкі, праз якое выяўляецца праблема нацыянальнага самаўсведамлення ў кантэксце



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

распрацоўкі ідэі этнічнага і рэгіянальнага асэнсавання самабытнасці беларускага народа, характэрныя для літаратурнай традыцыі XIX ст.

## Літаратура


1. Беларуская літаратура XIX стагоддзя : Хрэстаматыя / склад. і аўт. камент. А. А. Лойка, В. П. Рагойша. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1988. – 487 с.
2. Каратынскі, В. Творы : для ст. шк. узросту / В. Каратынскі ; уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 334 с.
3. Пачынальнікі : З гіст.-літар. матэрыялаў XIX ст. / Уклад. Г. В. Кісялёў ; Рэд. В. В. Барысенка, А. І. Мальдзіс. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2003. – 549 с.
4. Сыракомля, У. Выбраныя творы / У. Сыракомля ; уклад., прадм., камент. К. Цвіркі. – Мінск : Бел. навука, 2011. – 584 с. : [8] с. іл. – ("Беларускі кнігазбор" : Серыя I. Мастацкая літаратура).


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова